5—7 лет, а профессиональиую эрудицию приобрели после 8—10 лет работы в школе.

Во время работы в школе 60 % из числа опрошенных столкнулись с трудностями в проведеиии иидивидуальной работы с учащимися, 35 % указали иа проблему работы с «трудными» подростками, 40 % — на сложиость работы и с одаренными детьми, 27 % — со слабоуспевающими. 20 % респоидеитов не умели к концу обучения в вузе вести документацию (составить технологическую карту урока, подобрать задания по уровням, грамотно заполнить классный журнал и т. п.).

В этой связи отметим, что студентам педагогических вузов необходимо посешать расширенные практикумы и семинары по педагогике и психологии в школах, открытые уроки и воспитательные мероприятия, классные часы, заниматься индивидуальной работой с учащимися.

Учителю необходимо знать способы подготовки к учебным занятиям, правильно определить структуру, содержание и методику преподавания отдельных этапов урока, сочетать различные формы и методы проверки и оценки знаний учащихся, проведения индивидуальной работы. Учитель должен грамотно составить план урока, определить его цели и задачи, подобрать дидактический материал, спланировать индивидуальные задания, задания по группам и сделать правильно анализ урока.

В ходе педагогической практики студенты могут приобрести хорошую педагогическую умелость. Педагогическая умелость — это основа профессионализма, она базируется на достаточиой теоретической и практической подготовке учителя, которая обеспечивается в педагогических учебных заведениях и продолжает отшлифовываться и совершенствоваться в школе.

## ПРОБЛЕМА ПРАФЕСІЙНА-МАЎЛЕНЧАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

*Дз. М. Дубініна, г. Мінск*

Наяўнасць сітуацыі блізкародиаснага руска-беларускага білінгвізму значна ўплывае на прафесійиа-маўленчую падрыхтоўку студэнтаў факультэта дашкольнага выхавання БДПУ. Будучым спецыялістам иеабходна авалодаць як методыкай навучання дзяцей роднай мове, так і методыкай навучаиня другой блізкароднасиай мове.

Вядомая даследчыца дзіцячага маўлення, доктар педагагічных иавук А. М. Богуш разглядае прафесійиа-маўлеичую падрыхтоўку студэитаў як полікампаиеитиы феномен, у структуру якога ўваходзяць чатыры віды маўленчай кампетэнцыі.

Сярод іх: лінгвістычная (веды аб мове як сістэме, здольнасць здзяйсняць параўнальны аналіз дзвюх моў на любым ўзроўні); лінгвадыдактычная (здольнасць ужываць на практыцы асноўныя палажэнні метадычнай навукі пра навучанне роднай і другой блізкароднаснай мове), камунікатыўная (здольнасць уступаць у зносіны на рускай і беларускай мовах у розных сітуацыях вучэбна-маўленчай дзейнасці з улікам сацыяльных норм паводзін); кагнітыўна-народазнаўчая (наяўнасць сумы ведаў пра побыт, культуру, абрады, традыцыі беларускага народу).

З улікам розных відаў маўленчай кампетэнцыі на факультэце сродкамі мэтанакіраванага выкарыстання дысцыплін лінгвістычнага і лінгвадыдактычнага і педагагічнага цыклаў створана мадэль прафесійна-маўленчай падрыхтоўкі студэнтаў. У вучэбным працэсе вызначана месца кожнага тэарэтычнага і практычнага курса.

На I курсе навучання студэнты вывучаюць рускую мову, беларускую мову, гісторыю Беларусі. Такім чынам, ад самага пачатку ў будучых спецыялістаў фарміруецца лігнгвістычная, камунікатыўная і народазнаўчая кампетэнцыі. У будучым на гэтым курсе прадугледжваецца выкладанне такой дысцыпліны, як лінгвістыка дзіцячага маўлення, што станоўча паўплывае на лінгвістычную падрыхтоўку студэнтаў. Разам з тым гэта дасць магчымасць здзяйсняць мэтанакіраваную падрыхтоўку спецыялістаў у галіне элементарнай лінгвістычнай адукацыі дашкольнікаў.

На II курсе вывучаюцца дысцыпліны як лінгвістычнага (культура маўлення, рыторыка), так і дыдактычнага (дашкольная педагогіка) і лінгвадыдактычнага цыклаў (методыка развіцця маўлення і навучання роднай мове). Разам з лінгвістычнай і камунікатыўнай адбываецца фарміраванне лінгвадыдактычнай і кагнітыўна-народазнаўчай кампетэнцыі. Лінгвадыдактычная падрыхтоўка студэнтаў вядзецца ў тэарэтыка-метадычным плане, які адпавядае рэфлектыўнаму ўзроўню. Вучэбны матэрыял падаецца ў адпаведнасці з агульнай стратэгіяй развіцця беларускага маўлення і навучання дашкольнікаў беларускай мове як роднай (Н. С. Старжынская).

На III курсе працягваецца вывучэнне дысцыплін лінгвадыдактычнага цыкла (методыка развіцця маўлення і навучання роднай мове дашкольнікаў), спецкурс па навучанні дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове, спецсемінар па вывучэнні дзіцячага фальклору. Навучанне студэнтаў адбываецца з дапамогай вучэбных дапаможнікаў, якія створаны выкладчыкамі кафедры методык дашкольнай адукацыі: прафесарам, доктарам педагагічных навук Н. С. Старжынскай, дацэнтам, кандыдатам педагагічных навук Дз. М. Дубінінай.

Студэнты працуюць з гэтымі вучэбнымі дапаможнікамі ў час падрыхтоўкі да семінарскіх і практычных заняткаў. У працэсе самастойнай работы будучыя спецыялісты вывучаюць наступныя вучэбныя дапаможнікі:

— *Старжынская Н. С.* Беларуская мова ў дзіцячым садзе. Мн., 1995.

— *Дубініна Дз. М., Старжынская Н. С.* Мастацка-маўленчая дзейнасць у дзіцячым садзе. Мн., 1999.

— *Старжынская Н. С.* Методыка развіцця роднага маўлення. Мн., 1998.

— *Дубініна Дз. М.* Мая родная старонка. Мн., 2000.

— *Старжынская Н. С.* Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў. Мн., 2000.

— *Старжинская Н. С.* Обучение грамоте в детском саду. Мн., 2000.

— *Старжинская Н. С.*, Дубинина Д. Н., Белько Е. С. Учим детей рассказывать. Мн., 2003.

— *Старжынская Н.С.*, Дубініна Дз. М. Развіццё беларускамоўных зносін дашкольнікаў. Мн., 2001.

На IV курсе працягваецца фарміраванне народазнаўчай кампетэнцыі студэнтаў. Яны знаёмяцца з культурай Беларусі, яе народнымі промысламі.

З улікам усіх аспектаў праблемы двухмоўя, Канцэпцыя развіцця дашкольнай адукацыі Рэспублікі Беларусь вызначае неабходнасць стварэння адзінай сістэмы моўнага развіцця дзяцей, дзе прадугледжваецца адначасовае навучанне беларускай і рускай мовам у беларускамоўных дзіцячых садах, што рэальна знаходзяцца ў рускамоўным асяроддзі, і ў дашкольных установах з рускім моўным рэжымам. Авалодванне разам з рускай багаццем беларускай мовы ў розных тыпах дашкольных устаноў складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы дзіцяці як прадстаўніка пэўнага этнасу, спрыяе выхаванню яго высокай маўленчай культуры.

Па сцвярджэнні вядомага беларускага педагога А. А. Грымаця, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці дзяцей пераддашкольнага і дашкольнага ўзросту пачынаецца менавіта з пазнання роднай мовы, з усведамлення яе як найвялікшай каштоўнасці і святыні свайго народу.

На V курсе дзённага аддзялення для бакалаўраў і на апошнім курсе вячэрняга аддзялення доктарам педагагічных навук, прафесарам Н. С. Старжынскай чытаецца курс «Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў». У час выкладання дысцыпліны студэнты знаёмяцца з тэарэтычнымі асновамі беларускамоўнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту ў сітуацыі руска-беларускага двухмоўя, спецыфікай

методыкі развіцця беларускага маўлення рускамоўных дзяцей, шляхамі фарміравання ў дашкольнікаў матывацыйнай сферы маўленчай дзейнасці на беларускай мове, сістэмай развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.

Студэнтам V курса чытаецца і спецкурс па навучанні дашкольнікаў грамаце. Праграма падрыхтоўкі накіравана на авалодванне будучымі спецыялістамі метадамі і прыёмамі навучання дашкольнікаў навыкам элементарнага лінгвістычнага аналіза, развіцця іх мэталінгвістычных здольнасцей. Канцэнтрацыя ўвагі на мове як на самастойным аб'екце пазнавальнай дзейнасці, па меркаванні даследчыцы дзіцячага маўлення С. Н. Цэйтлін, з'яўляецца найбольш актуальнай, таму што ў наш час на першы план выступаюць ідэі гуманітарызацыі выхавання і адукацыі. Дашкольнікі, атрымаўшыя элементарную лінгвістычную адукацыю, здольныя творча падыходзіць да вырашэння разнастайных задач лінгвістычнага характару. Авалоданне дзецьмі навыкамі элементарнага лінгвістычнага аналізу ўплывае на чытанне і пісьмо, служыць прафілактыцы графічных і арфаграфічных памылак у пісьмовым маўленні.

Такім чынам, у прафесійна-маўленчай падрыхтоўцы студэнтаў факультэта дашкольнай адукацыі ўжываецца міждысцыплінарны падыход, які рэалізуецца ў міжпрадметных сувязях.

Інтэгральная сістэма падрыхтоўкі студэнтаў здзяйсняецца сродкамі сумежных дысцыплін лінгвістычнага, лінгвадыдактычнага і педагагічнага цыклаў. Заўважым, што ў выкладанні дысцыплін лінгвістычнага цыкла адбываецца прафесійная арыентацыя вучэбнага матэрыялу на работу з дашкольнікамі, а ў эмпірычным плане прафесійна-маўленчая падрыхтоўка студэнтаў здзяйсняецца ў час іх вытворчай практыкі.

## ФОРМИРОВАНИЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЫ БУДУЩИХ ПЕДАГОГОВ ДОШКОЛЬНОГО УЧРЕЖДЕНИЯ

*М. И. Мазовко, г. Минск*

Новые социально-политическпе обстоятельства требуют коренного улучшения подготовки специалистов для учреждений системы образованпя Республики Беларусь. Становление рыночных отношений требует совершенного профессионализма, экологической образованности, нравственной воспитанности педагога.

Перед педагогическими коллективамп вузов республики стоит задача улучшения профессиональной подготовки выпускников и совершенствования всех направлений учебно-воспитательной